Сярод аб'ектаў экалагічнага турызму цікавую праграму прапануе Налібоцкі заказнік. Падчас акцыі тут даецца зніжка на прагулку па экалагічнай сцежцы «Сябрыньская ростань» — менавіта там можна пабачыць тарпанападобных дзікіх коней і паглядзець, як разводзяць цецерукоў. Ды і сам па сабе заказнік зручна размешчаны, цікавы і дае адчуванне знаходжання ў дзікай прыродзе.

Адны з самых актыўных удзельнікаў акцыі «Вандруй. Адчуй. Натхняйся» — музеі, якія прапануць і зніжкі, і бясплатныя экскурсіі, і майстар-класы, і квэсты. Спіс усіх аб'ектаў знаходзіцца на сайце Нацыянальнага агенцтва па турызме. Там жа пералік мерапрыемстваў. Адметна, што ўдзельнічаюць усе без выключэння раёны краіны. Толькі ў Віцебскай вобласці прадстаўлена больш чым 200 аб'ектаў. На гэтым рэсурсе размешчаны і маршрутызатар, па якім можна выбраць, як даехаць, дзе спыніцца на перакус і начлег і іншае, а таксама абраць для сябе від турызму.

Летам пачынаецца і чарговы конкурс сацыяльнай рэкламы «Пазнай Беларусь». Падчас падарожжа кожны можа стаць яго ўдзельнікам у трох намінацыях: «Плакат», «Слоган» і «Відэаролік». Яго вынікі падводзяцца ў верасні.

Як адзначыла Ірына Варановіч, калі скласці топ самых папулярных відаў турызму ўнутры краіны, то ў яго ўвойдуць санаторна-курортнае лячэнне, аграэкатурызм, такія віды актыўнага адпачынку ў летні час, як байдарачныя сплавы, велапрабегі, а таксама экалагічныя сцежкі і экалагічны турызм. На сайце Нацыяльнага агенцтва па турызме маецца і рэестр экскурсаводаў, да якіх можна звяртацца, і пералік маршрутаў, па якіх яны атэставаныя. Спецыяліст нагадала, што з бягучага года экскурсіі праводзяць толькі атэставаныя экскурсаводы.



## Не толькі Мір і Нясвіж

Дзмітрый Марозаў расказаў пра навінкі, што з'явіліся сёлета. Гэта і фінальная чарга рэстаўрацыі ў Косаўскім палацы роду Пуслоўскіх, якая адкрылася нядаўна, — адзін з турыстычных аб'ектаў, які цяпер дынамічна развіваецца. Актыўна працягваецца рэстаўрацыя ў Ружанскім палацы роду Сапег. Аднаўляюцца Крэўскі і Гальшанскі палацы, прычым з прынцыпова новымі падыходамі да рэстаўрацыі. З ліку завершаных і стыльных праектаў, безумоўна, можна вылучыць палац Валовічаў у Свяцку, які будзе цікавы як дасведчанаму турысту, так і навічку. Далёка не ўсе пабывалі і ў Гродзенскім палацы, а гэта турыстычны комплекс, між іншым, узроўню знакамітых Мірскага і Нясвіжскага замкаў.

Усе абласныя цэнтры і такія гарады, як Полацк, Навагрудак, Пінск, таксама не стаяць на месцы — там рэканструююць гістарычныя пабудовы, адкрываюць новыя аб'екты размяшчэння, сувенірныя крамы, праводзяць цікавыя мерапрыемствы, напоўненыя падзеямі. На сайце Нацыянальнага агенцтва па турызме размешчаны каляндар падзей на бягучы год.

## Што прапануюць аматарам паляўнічага турызму?

Адзін з запатрабаваных напрамкаў, у тым ліку і ў замежных гасцей, — паляўнічы турызм. Інфармацыю па паляўнічых турах можна атрымаць на сайце «Белдзяржпаляванне». Там ёсць пералік усіх комплексаў сістэмы Міністэрства ляснной гаспадаркі. Там жа можна забраніраваць паляўнічыя туры. Комплексы аказваюць шырокі спектр паслуг, ад пражывання да суправаджэння веламаршрутаў і экалагічных сцежак.

Яшчэ адзін напрамак, які прапануюць аб'екты «Белдзяржпалявання», — экалагічны турызм, у прыватнасці сплаў на байдарках у Налібоцкай пушчы. Як расказаў **дырэктар РУП «Белдзяржпаляванне» Вадзім КРУЦЬКО,** ужо на сёлетні сезон распрацаваны шэраг такіх маршрутаў — па рэках Уса, Заходняя Бярэзіна, Іслач, Нёман. Распрацоўваецца маршрут па сплаве па Нёмане на плытах. Уздоўж турыстычнага шляху маюцца альтанкі і нават палявая лазня. Усё можна забраніраваць загадзя і аплаціць анлайн. Хутка адкрыецца маршрут па Заслаўскім вадасховішчы, ён пачынаецца на 6-м кіламетры МКАД. Да паслуг байдарачнікаў таксама абсталяваны альтанкі і лазня-бочка.

Паляўнічыя туры арганізоўваюцца і ў гаспадарկі сістэмы Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Як адзначыў **намеснік начальніка ўпраўлення палявання, рыбалоўства і турызму БТПР Уладзімір КАЗЛОЎСКІ,** летась праведзена больш за 800 паляўнічых тураў, падчас якіх у нашу краіну прыехала больш як 1700 замежных паляўнічых.

— Што прыцягвае замежных турыстаў? Капытныя паляўнічыя жывёлы — лось, алень і казуля, а таксама лані. Іх колькасць у Беларусі вышэйшая, чым у суседніх рэгіёнах Расіі, і дастойны ўзровень паляўнічага сэрвісу. Праводзяцца работы па рассяленні гэтых жывёл, — расказаў спецыяліст.

Дазволена ў Беларусі і паляванне на зубра. Гэтая жывёла мае асаблівы статус. З аднаго боку, ён уключаны ў Чырвоную кнігу, з іншага — на яго часткова дазволена паляванне. Здабываць можна толькі зуброў рэзервовага генафонду, гэта, як правіла, хворыя жывёлы, адбракаваныя спецыяльнай камісіяй. Паляванне нятаннае, але на яго ёсць запыт з боку замежных турыстаў.

**Алена КРАВЕЦ.**

# ЦУДОЎНАЕ ВЯРТАННЕ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Руплівыя вяскоўцы адраджаюць сваё паселішча і, вядома, будуюць новую святыню, на гэты раз царкву называюць у гонар святой Параскевы Пятніцы. Але прастаяла яна нядоўга, падчас вайны расійскага войска з польскімі канфедэратамі зноў згарэла сяло разам з храмам. І ў 1784 годзе прыхаджане ўзводзяць храм на старым падмурку, будуюць па старадаўніх тэхналогіях без адзінага цвіка. Праўда, спачатку ён быў уніяцкім, а з 1865 года і да сённяшняга дня — праваслаўны.

Помнік драўлянага дойлідства з элементамі барока цяпер ва ўсіх даведніках называюць адным з найпрыгажэйшых храмаў на Палессі. У плане ён уяўляе сабой прамавугольнік з двухсхільным дахам. Галоўны фасад завершаны трохвугольным франтонам. Перад храмам — брама-званіца.

Цікава, што сцены царквы ўзводзілі ў Здзітаўскай пушчы. Для будаўніцтва падбіралі самую лепшую сасну, былі майстры на нашай зямлі, умелі знайсці дрэва, што прастаіць вякі. А сюды ўжо перавозілі валамі і коньмі і звёнамі падганялі пад падмурак. Як зладжылі царкву, так яна і стаіць па сёння.

— У нас ёсць некалькі асабліва значных абразоў. Напрыклад, ікона 1658 года, якая была напісана яшчэ для першага храма. Маюцца іншыя старадаўнія абразы. Уяўляеце сабе, — гаворыць бацюшка, — вёска гарыць, хаты з саламянымі дахамі палаюць, а людзі бягуць у царкву і абразы ратуюць! Так і зберагалі гадамі, стагоддзямі. У Бездзежы заўсёды жылі набожныя людзі...

## Дар ад святара Катлубоўскага

Вернікі храма маюць усе падставы ганарыцца, напрыклад, іконай Святой Тройцы, напісанай менавіта для гэтай царквы. Абраз, акрамя выявы трох іпастасяў Бога ў выглядзе трох анёлаў, якіх частуе ветхазаветны Аўраам, адлюстроўвае святых Аляксандра Свірскага, Ануфрыя Вялікага і Іаана Багаслова. Гэтыя святыя звязаныя з гісторыяй бездзежскага храма. У канцы XIX стагоддзя тут служыў Аляксандр Катлубоўскі з патомнай дынастыі святароў. І былі ў той дынастыі таксама Ануфрый ды Іаан, а значыць, святыя на іконе былі іх нябеснымі апекунамі. Названая ікона прынесена ў дар царкве з нагоды яе 130-гадовага юбілею. Ёсць яшчэ старадаўняя ікона «Гасціннасць», на якой Аўраам і Сара частуюць Госпада, што прыйшоў да іх у выглядзе Трох Падарожнікаў. Абразы сваёй царквы тутэйшыя людзі любяць і шануюць...

Дык вось адзін з дынастыі Катлубоўскіх прынёс у дар храму Евангелле ў 1890 годзе з нагоды канчыны сваёй маці, ураджэнкі С.-Пецярбурга. Яна жыла і памерла ў паўночнай сталіцы, але была прывезена сюды і пахавана ў агароджы храма. Яе магілу і цяпер дагледаюць прыхаджане. На адваротным баку металічнага акладу святыні ёсць надпіс «Гэта святое Евангелле прынесена



ў дар царкве ў імя Святой Жыванапачальнай Тройцы ў мястэчку Бездзеж Кобрынскага павета Гродзенскай губерніі на вечны ўспамін рабы божай Феафілы, якая памерла ў С.-Пецярбургу ў 14 дзень кастрычніка 1890 года і адданая зямлі ў агароджы названай царквы».

Царква ніколі не закрывалася, перажыла ўсе войны XX стагоддзя. А з 1890 года ў богаслужэннях выкарыстоўвалі Евангелле, выпушчанае ў друкарні С.-Пецярбурга ў 1887 годзе, падоранае Аляксандрам Катлубоўскім. «Вось якая папера адмысловая, трывалая, — паказвае айцец Генадзь, — цяпер такіх кніг не выпускаюць. Яна адразу была выраблена ў гэтым прыгожым акладзе, рабілі тады на стагоддзі, адным словам. Служыла верай і праўдай Евангелле бездзежцам да пачатку апошняй вайны».

## Сувенір за выратаванне

— Цяпер тых бабулек ужо няма, а я яшчэ застаў іх, цяпер шкадую, што не запісалі падрабязных расповедаў, — працягвае айцец Генадзь. — Дык вось баба Поля ўспаміналa, як у 1942 годзе ўсю вёску сагналі на невялікую плошчу перад царквой. Многія тады вёскі ў ваколіцы пацярпелі, акупанты жорстка распраўляліся нават за намёк на сувязь з партызанамі. Так і ў Бездзежы было. Сагналі ўсіх, каго засталі, старых і малых — таксама, акружылі, паставілі кулямётчыкаў насупраць. Людзі плакалі, маліліся, думалі, што апошнія хвіліны жыцця застаюцца. Так, відаць, і было б... Тады ў царкве служыў айцец Віктар, чалавек надзвычай адукаваны, свабодна валодаў некалькімі замежнымі мовамі. Ён загаварыў з нямецкім афіцэрам па-нямецку і запрасіў яго ў храм.

Людзі чакалі. Ніхто не ведаў, пра што гаварылі яны ў храме, заставаліся там даволі доўга, але неўзабаве выйшлі, і афіцэр аддаў каманду зняць ачапленне. Пад пахай у вайскоўца быў скрутак, тады нават увагі ніхто не звярнуў на тую акалічнасць. Потым у вёсцы сталі гаварыць, што святар ва ўдзячнасць за выратаванне жыхароў вёскі сам падарыў афіцэру гэтае Евангелле. Так, відаць, і было.

## Зняты з аўкцыёну лот

А потым — канец вайне, Перамога, мяняліся святары, мянялася жыццё, ніхто і не ўспамінаў аб прапажы. І не ўспомніў бы, відаць, да гэтай пары, каб святыня не аказалася на аўкцыёне ў Мюнхене ў 2011 годзе. Ды і там яна, напэўна, была б прададзена і недзе пылілася б у прыватнай калекцыі. Але ж трэба было такому здарыцца, што менавіта ў дні правядзення аўкцыёну ў Мюнхене гасцявалі святары з Палесся. Благачынны Пётр Піліпчук з Ганцавіч і яго калегі праз гаспадара Аўкцыённага дома выйшлі на ўладальніка лота, які з'явіў першапачатковы кошт 6700 еўра. Расказалі яму пра гісторыю кнігі, пра выратаванне людзей. Доказам служыла гравіроўка пра тое, што Евангелле перададзена на вечнае карыстанне царкве ў Бездзежы. Уладальнік быў уражаны пачутым і пагадзіўся перадаць святыню бязвыплатна сапраўдным гаспадарам.

«Такім чынам, 2 жніўня 2011 года, у дзень прарока Іллі, Евангелле вярнулася ў царкву. Тут ужо я служыў, — расказвае айцец Генадзь. — Была вялікая радасць для нашых людзей, святкавалі вяртанне святыні. Правялі ўрачыстыя богаслужэнні з гэтай нагоды».



Плошча, дзе стаялі людзі ў чаканні лёсу.

## Шануюць сваё

— Мяне потым пыталі, колькі ж вы заплацілі, каб забраць з аўкцыёну свой рарытэт. А я адказаў: «Роўна столькі, колькі заплацілі за яго некалі, забіраючы яго ад нас».

Айцец Генадзь, несумненна, чалавек з гумарам. Ён расказваў, як прыязджалі ў царкву ахвотнікі забраць іконы ў музей, але вясковы святар знайшоў тыя словы, якія пераканалі вучоны люд забыцца дарогу і не хваляваць прыхаджан, якія пакаленнямі даказвалі сваю набожнасць: «Вы хочаце пазбавіць абразы літургійнай прысутнасці, зрабіць так, каб яны раз у год выстаўляліся на агляд, а астатнюю частку стаялі ў сховішчах-запасніках? А людзей, чые продкі з рызыкай для жыцця ратавалі іконы, хочаце пакрыўдзіць?» І вучоным мужам заставалася пагадзіцца з няўрымслівым вясковым святаром.

«Паглядзіце, якімі ручнікамі ўпрыгожваюць нашы ўмелыя майстрыхі храм!» — не без гонару паказвае настаяцель. Сапраўды, на радзіме «Бездзежскага фартушка» ўмеюць ствараць з дапамогай іголкі сапраўдную раскошную прыгажосць. Тут не толькі ручнікі, сурвэткі, але і харугвы расшытыя рукамі вясковых майстрых.

Пра незвычайнае па сваёй набожнасці месца давялося пачуць ад многіх жыхароў Бездзежа і навакольных вёсак. Настаўніца Тацяна Ялец гаворыць: «Выходзіш з гэтай царквы нібы пацалаваны, абноўлены... Усе ходзяць у нашу царкву, на службах тут шматлюдна». Сапраўды, нячаста сустрэнеш, што ў вясковым храме спявае мужчынскі хор, а тут спяваюць мужчыны з цудоўнымі галасамі. Хор нярэдка запрашаюць на розныя фестывалі харавога мастацтва альбо праваслаўных спеваў».

**Старшыня Бездзежскага сельскага Савета Інэса КАЛАСЕЙ** гаворыць, што ў асяродку вяскоўцаў шануюцца як царкоўныя, так і векавыя культурныя традыцыі. Абрад «Велікодная Стрылка» сёння вядомы далёка за межамі Бездзежа, у Беларусі ён адзін такі.

На першы дзень Вялікадня вячэрня тут называецца «Нешпар». Завяршаецца вячэрня, пачынаецца хрэсны ход. Тым часам ужо рыхтуецца сцэна, нядзельная школа дае канцэрт, гучаць віншаванні з Уваскрэсеннем Хрыстовым, а потым пачынаецца карагод «Велікодная Стрылка». Стрылка на мясцовай гаворцы азначае насенне. Карагод выстройваецца трохвугольнікам і вядзецца вакол трох дзяўчынак — «зярнятак» пад народную песню. Такім чынам карагод просіць Божага благаславення на пасевы, на добры ўраджай.

Цікава, што ў Бездзежы гавораць: «Да Стрылкі не п'юць гарылкі». Лічыцца, што святкаваць з музыкай, танцамі альбо выпіўкай можна толькі пасля вячэрняга богаслужэння першага дня Вялікадня, а не раней. Кажуць, што гэтаму абраду, як і самому Бездзежу, не менш за 600 гадоў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ,**
*Драгічынскі раён.*

Будзь у курсе!

# ПРЫЁМНАЯ КАМПАНІЯ Ў ССНУ БУДЗЕ ДОЎЖЫЦЦА МЕСЯЦ

**Прыём дакументаў на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі распачнецца ў каледжах 20 ліпеня. Тэрміны ўступнай кампаніі вызначаны пастановай Міністэрства адукацыі.**

Абітурыенты, якія паступаюць пасля 9 класа ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы на дзённую форму атрымання адукацыі за кошт бюджэту, падаюць дакументы з 20 ліпеня да 3 жніўня, на платную дзённую форму — з 20 ліпеня да 14 жніўня. Абітурыентам дзённай формы атрымання адукацыі, якія паступаюць на платную форму навучання на спецыяльнасці, дзе трэба здаваць уступны іспыт, дакументы трэба падаць да 3 жніўня.

Выпускнікам 11-х класаў і ўстаноў прафтэхадукацыі, якія паступаюць на вочную (дзённую, вячэрнюю), дыстанцыйную або завочную формы атрымання адукацыі за кошт сродкаў бюджэту, неабходна прадаставіць дакументы з 20 ліпеня да 12 жніўня, «платнікам» — з 20 ліпеня да 20 жніўня. Калі ж пры паступленні прадугледжаны ўступны іспыт, то і «платнікі» падаюць дакументы да 12 жніўня.

Уступныя іспыты ў ССНУ на дзённую форму атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі на аснове агульнай базавай адукацыі за кошт сродкаў бюджэту і на платнай аснове пройдуць з 4 да 8 жніўня, на вочную (дзённую, вячэрнюю), дыстанцыйную або завочную форму атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі на аснове агульнай сярэдняй або прафтэхадукацыі за кошт бюджэту і на платнай аснове — з 13 да 15 жніўня.

Залічаць абітурыентаў з агульнай базавай адукацыяй на дзённую форму атрымання адукацыі на бюджэт да 10 жніўня, «платнікаў» — да 16 жніўня. На аснове агульнай сярэдняй або прафтэхадукацыі залічэнне на дзённую бюджэтную форму навучання адбудзецца да 16 жніўня. На дзённай, дыстанцыйнай або завочнай форме атрымання адукацыі на платнай аснове на аснове агульнай сярэдняй і прафесійна-тэхнічнай адукацыі апошні дзень залічэння — 21 жніўня.

Аб дадатковым наборы на бюджэтныя месцы, што засталіся вакантнымі пасля залічэння, абітурыенты з агульнай базавай адукацыяй, якія паступаюць на дзённую форму атрымання адукацыі, павінны быць праінфармаваныя не пазней за 11 жніўня. Абітурыенты з агульнай сярэдняй або прафтэхадукацыяй даведаюцца аб вакантных месцах не пазней за 17 жніўня.

Для абітурыентаў, якія плануюць паступаць на спецыяльнасці напрамкаў «Сельская гаспадарка», «Ветэрынарыя» ў вочнай (вячэрняй) або завочнай форме атрымання адукацыі за кошт сродкаў бюджэту або на платнай аснове тэрміны прыёму дакументаў, — з 15 кастрычніка да 30 лістапада. Залічэнне — да 10 снежня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# «КАДРАВАЯ ЛЕСВІЦА» — ДЛЯ КАДРАВАГА РЭЗЕРВУ

**Праект з такой назвай стартаваў у БДУ. Гэта ўнікальная двухтыднёвая праграма, якая не мае аналагаў ва ўніверсітэтах Беларусі. Праект ініцыяваны і рэалізоўваецца грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь», БРСМ і БДУ.**

**Рэктар БДУ Андрэй КАРОЛЬ** адзначыў важнасць і своечасовасць ініцыятывы. З яго слоў, сёння назіраецца запатрабаванасць у аўтарытэтных лідарах думкі, якія даступнай мовай змаглі б растлумачыць розным узроставым аўдыторыям грамадска-палітычныя падзеі ў краіне і свеце. Ад іх актыўнасці і эфектыўнасці работы залежыць бяспека краіны, у тым ліку і інфармацыйная. Рэктар упэўнены, што ў БДУ сярод моладзі ёсць вельмі перспектыўныя студэнты і выкладчыкі, арыентаваныя на грамадскую дзейнасць. «Для развіцця іх асобасных, арганізатарскіх, камунікатыўных і кіраўніцкіх навыкаў, а таксама кадравага росту арганізацый распрацавана навучальная праграма «Кадравая лесвіца», — падкрэсліў кіраўнік ВНУ. — Мяркуецца, што ўдзельнікі праекта працягнуць сваю актыўную грамадскую дзейнасць падчас працы і вучобы ў БДУ і ўвойдуць у базу ідэалагічнага рэзерву ВНУ і краіны».

Першымі слухачамі школы сталі 25 актывістаў з ліку студэнтаў, маладых выкладчыкаў і супрацоўнікаў ВНУ. Гэта члены РГА «Белая Русь» і пярвічнай арганізацыі БРСМ БДУ.

Усяго курс уключае каля 30 заняткаў. Удзельнікаў інтэнсіву чакаюць лекцыі, тэматычныя дыскусіі, практычныя семінары і выязныя мерапрыемствы на дзяржаўныя прадпрыемствы і грамадскія арганізацыі. Спікерамі выступяць вядучыя эксперты ў галіне палiталогіі, права, гісторыі, псіхалогіі, журналістыкі і інш. Гэта выкладчыкі пяці факультэтаў: юрыдычнага, філалагічнага, гістарычнага, журналістыкі, філасофіі і сацыяльных навук. Яны раскажуць аб асаблівасцях ідэалогіі беларускай дзяржавы, канстытуцыйных каштоўнасцях, пагрозе радыкалізму і экстрэмізму ў сучасным палітычным працэсе, актуальнай міжнароднай абстаноўцы, генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і інш.

Практычныя заняткі дазволяць развіць навыкі эфектыўнага ўзаемадзеяння з органамі дзяржаўнай улады, прамоўніцкага майстэрства, асвоіць аналіз палітычных тэкстаў, методыкі процідзеяння маніпулятыўнаму ўздзеянню ў інфармацыйнай прасторы і інш.

Таксама ў рамках курса слухачам трэба будзе распрацаваць камандны праект па правядзенні дыялогавай пляцоўкі або грамадска значнага мерапрыемства. Найлепшыя прапановы будуць рэалізаваны на пляцоўках краіны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# У Мінску з'явіўся новы музей

**У сталіцы адбылося ўрачыстае адкрыццё музейнага пакоя гісторыі Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў. Кіраўнік БТПР Ігар ШУНЕВІЧ адзначыў: «Гэта першы крок да стварэння нацыянальнага музея палявання і рыбалоўства». Экспазіцыя ўключае архіўныя матэрыялы, якія расказваюць пра асноўныя этапы стварэння і работы арганізацыі, стэнды з найбольш значнымі ўзнагародамі беларускіх паляўнічых і рыбаловаў, рэдкія кнігі аб прыродакарыстанні, калекцыю куль і ўзоры паляўнічых стрэльбаў. Адмысловае месца ў музеі займае дыярама, якая паказвае момант палявання.**



Гісторыя БТПР налічвае ўжо больш за 100 гадоў. У снежні 1921 года быў зацверджаны першы статут і абраны рабочыя органы. Там, на I Усебеларускім з'ездзе паляўнічых, прысутнічала 26 дэлегатаў ад 60 паляўнічых рэспублікі. Сёння ў шэрагах арганізацыі больш за 70 тысяч чалавек. Штогод таварыства праводзіць розныя спаборніцтвы і выстаўкі, арганізоўвае паляванні і рыбалку як для нашых грамадзян, так і гасцей краіны. На пастаяннай аснове вядзецца работа па рассяленні дзікіх жывёл, зарыбленні значных вадаёмаў, ажыццяўляюцца біятэхнічныя мерапрыемствы.

**Начальнік Дзяржінспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь Юрый ТЭРТЭЛЬ,** выступаючы на адкрыцці музейнага пакоя, адзначыў ролю сумеснай дзейнасці БТПР і інспекцыі, накіраванай на захаванне і памнажэнне прыродных багаццяў краіны, іх рацыянальнага выкарыстання і выхаванне шчырых аматараў прыроды. Музей для грамадства — гэта крок да захавання гісторыі, даніна павагі папярэднікам і магчымасць больш падрабязна азнаёміцца з такім элементам культуры як паляванне.

Знакавай падзеяй мерапрыемства стаў удзел у ім групы школьнікаў. Ва ўрачыстай абстаноўцы падрастаючыя паляўнічыя і рыбаловы вымавілі ўрачыстае абяцанне «Юнага БТПРаўца», пасля чаго Ігар Шуневіч уручыў ім членскія білеты. Прысутным старшыня БТПР растлумачыў, што, згодна з актуальнай рэдакцыяй статута, цяпер у шэрагі таварыства можна ўступаць пры наяўнасці згоды бацькоў з 8 гадоў. Прыём ажыццяўляецца ва ўсіх абласных арганізацыях таварыства. Што ж датычыцца музейнага пакоя, то, на думку Ігара Шуневіча, ён абавязкова будзе садзейнічаць асвеце моладзі і папаўненню шэрагаў юных БТПРаўцаў.

**Андрэй КАРАБЕЛЬНІКАЎ,**
**фота аўтара.**

Боегатоўнасць

# ТЭРЫТАРЫЯЛЬНАЯ АБАРОНА ЯК ПАЎНАВАРТАСНАЯ СІЛА ВАЕННАГА РЭАГАВАННЯ

## У Гомелі пад кіраўніцтвам міністра абароны адбыўся штогадовы збор «Ваенная бяспека і абарона дзяржавы»

**У зборы ўзялі ўдзел старшыні абласных і Мінскага гарадскога выканаўчых камітэтаў, ваенныя камісары абласцей і сталіцы. У адпаведнасці з рашэннем кіраўніка дзяржавы мерапрыемства праводзіцца дзявяты раз. Яго мэта — павышэнне ўзроўню ведаў кіруючага складу рэгіянальных выканаўчых камітэтаў па пытаннях абароны дзяржавы і тэрытарыяльнай абароны.**



Як падкрэсліў **міністр абароны Віктар ХРЭНІН,** сёлета месцам правядзення збору Гомельская вобласць была выбрана невыпадкова. «Усе мы з'яўляемся сведкамі канфлікту паміж Расіяй і Украінай, — заўважыў кіраўнік абароннага ведамства. — Канфлікту, які быў па-майстэрску створаны і накіроўваецца рукамі ЗША і Вялікабрытаніі з задзейнічаннем рэсурсаў Еўропы. Ён прывёў да таго, што каля межаў Беларусі, у непасрэднай блізкасці ад нас, гінуць мірныя людзі, нашы браты — з аднаго і другога бакоў».

Генерал-лейтэнант звярнуў увагу на тое, што сучаснае развіццё ваенна-палітычнай абстаноўкі ў свеце і непасрэдна вакол Рэспублікі Беларусі патрабуе асаблівай увагі да пытанняў абараназдольнасці краіны. «Як адзначаў у сваіх выступленнях кіраўнік дзяржавы, усе нашы партнёры павінны ведаць, што беларуская міралюбнасць не сінонім ахвярнасці і што ў выпадку любой агрэсіі адказ будзе хуткі, жорсткі, адэкватны, — падкрэсліў Віктар Хрэнін. — Мы вывучаем і аналізуем развіццё сітуацыі ва Украіне, але ўжо цяпер можна зрабіць выснову, што процідзеянне надыходзячым войскам ажыццяўляецца комплексна ўсімі наяўнымі сіламі не толькі ваеннай арганізацыі дзяржавы, але і мясцовымі органамі ўлады. Тэрытарыяльная абарона з сістэмы забяспечвальнай трансфармуецца ў паўнавартасную баявую».

Па словах Віктара Хрэніна, сучасная абстаноўка вызначае неабходнасць больш цеснага ўзаемадзеяння кіраўнікоў абласцей і раёнаў, ваенных камісараў і камандуючых войскамі не толькі пры правядзенні мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі, але і для падрыхтоўкі тэрыторыі і насельніцтва.

Для ўдзельнікаў збору на тэрыторыі Гомельскай вобласці быў праведзены розыгрыш эпізоду практычных дзеянняў войскаў па абароне аб'ектаў тэрытарыяльнай абароны на вадзе.

Згодна з заданнем, адбылося рэагаванне на інфармацыю аб знаходжанні паблізу чыгуначнага моста групы невядомых. Пры правядзенні разведкі высветлілася, што гэта дыверсійна-разведвальная група саперніка. Камандзірам падраздзялення тэрытарыяльных войскаў было прынята рашэнне па нанясенні агнявога паражэння. Задзейнічалі артылерыю, зенітную ўстаноўку. Ваеннаслужачыя тэрытарыяльнай абароны заблакіравалі раён знаходжання ДРГ. Для знішчэння дыверсантаў былі задзейнічаны байцы Сіл спецыяльных аперацый, якія на верталёце Мі-8



дэсантаваліся і знішчылі групу, захапіўшы ў палон аднаго з яе ўдзельнікаў. На верталёце яго даставілі для допыту ў штаб тэрытарыяльнай абароны.

Практычна ва ўсіх абласных цэнтрах ёсць рэкі, таму адпрацоўка аховы мастоў і іншых аб'ектаў, як падкрэсліў міністр абароны Беларусі, асабліва актуальная. Між тым на базе адной з вайсковых часцей, размешчанай на тэрыторыі рэгіёна, удзельнікі збору пазнаёміліся з асноўнымі і перспектыўнымі ўзорамі ўзбраення, ваеннай і спецыяльнай тэхнікі, сучаснымі сродкамі аказання першай дапамогі, беспілотнымі авіяцыйнымі комплексамі. Усімі прадстаўленымі ўзорамі ўзбраення сёння забяспечана тэрытарыяльная абарона.

«Мы ўжо практычна поўнасцю адпрацавалі ўвесь цыкл падрыхтоўкі Закона «Аб народным апалчэнні», правялі эксперыменты на тэрыторыі некаторых сельскіх саветаў і бачым, што гэта дае вельмі станоўчы вынік, людзі актыўна адгукаюцца, гатовы ўдзельнічаць у абароне нашай Радзімы», — адзначыў у інтэрв'ю журналістам Віктар Хрэнін. Па словах кіраўніка ваеннага ведамства, падчас збору ў тым ліку падведзены вынікі дзейнасці тэрытарыяльнай абароны за мінулы год, вызначаны новыя шляхі і кірунак развіцця.

На адным з навучальных месцаў была прадэманстравана адпрацоўка абароны населенага пункта з апорай на ўмацаваны раён. «Падкрэслю, што ўсё, што мы робім, накіравана толькі на адно: каб нашы людзі былі ўпэўнены ў будучыні, спакойна маглі гадаваць дзяцей, жыць на роднай зямлі», — падкрэсліў міністр абароны.

У ходзе збору было адкрыта новае сучаснае стрэльбішча, якое размясцілася на ўчастку плошчай больш чым 4 гектары. Яго максімальная прапускная здольнасць — ад 150 да 200 чалавек у суткі. На аб'екце створаны ўмовы вучэбнай абстаноўкі, максімальна набліжаныя да тых, што запатрабаваны ў рэальным вядзенні баявых дзеянняў.

Новая падрыхтоўча-трэніровачная пляцоўка створана для адпрацоўкі практыкавання па стральбе, правядзення тактычных вучэнняў, вырашэння агнявых задач па практычным прымяненні правіл стральбы, кідання ручных вучэбна-імітацыйных гранат, падрыхтоўцы баявых прыпасаў. Канструктарскае рашэнне тэрыторыі стварае бяспеку як для ўсіх прысутных на тэрыторыі, так і для насельніцтва ў раёне стрэльбішча.

— У выпадку надзвычайнай сітуацыі губернатар — кіраўнік тэрытарыяльнай абароны, — адзначыў **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО,** — таму трэба не толькі ўмець страляць, але і, галоўнае, арганізаваць работу ўсёй тэрытарыяльнай абароны. Таму падчас збораў мы працуем на ўсіх участках, дзе вызначаны розныя падыходы, бо важна разумець, якім чынам і як вырашаюцца пастаўленыя задачы.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**
**Фота БелТА.**

Ноу-хау

# ГАРАНТ БЯСПЕКІ І МІРНАГА НЕБА

## Чым здзівіла XI Міжнародная выстаўка ўзбраення і ваеннай тэхнікі MILEX-2023?

**Ужо каторы год сталічная «Мінск-арэна», найперш знакамітая як спартыўная пляцоўка, напрыканцы вясны ператвараецца ў зброевы салон. Сёлета айчынным ваенна-прамысловым комплексам традыцыйна былі прадстаўлены тэхнічныя навінкі, навуковыя даследаванні і інавацыйныя тэхналогіі. Свае дасягненні ў абароннай сферы прадэманстравалі і нашы партнёры з Расіі, Кітая і Ірана — разам з беларускімі ўзорамі ўсяго паўтысячы перадавых распрацовак.**



Шматфункцыянальны беспілотны комплекс «Міратворац».

Выстаўка выклікала цікавасць у прадстаўнікоў як мінімум 30 краін — менавіта столькі замежных дэлегацый было заяўлена ў якасці кампаній-удзельніц. У выніку падпісаны кантракты на суму звыш як 266 мільёнаў долараў.

Навінкі, прадстаўленыя на выстаўцы, запатрабаваны часам і той неспакойнай абстаноўкай, якая апошнім часам пануе ў свеце. Сярод ноу-хау — комплексы радыёэлектроннай барацьбы, беспілотныя лятальныя апараты, бранятанкавая тэхніка, сістэмы супрацьпаветранай абароны, артылерыйскае і стралковае ўзбраенне, оптыка-электроннае абсталяванне і сістэмы, тэхніка і сродкі пажаратушэння, абмундзіраванне



Новы штурмавы касцюм, распрацаваны спецыялістамі Нацыянальнай акадэміі навук.

і сродкі індывідуальнай абароны і шмат іншае. Карэспандэнты «Звязды», якія працавалі на MILEX-2023, былі здзіўлены разнастайнасцю і шматфункцыянальнасцю многіх распрацовак. Аб некаторых з іх — у нашым рэпартажы.

### «Сапфір» і яго ювелірная работа

Увагу многіх наведвальнікаў выстаўкі прыцягнуў ручны супрацьтанкавы гранатамёт «Сапфір». Як сцвярджаюць спецыялісты, гэта гранатамётны комплекс новага пакалення. Ён лёгкі, малагабарытны, што немалаважна з пункту гледжання прымянення ў гарадскіх умовах. Маса зброі не перавышае 4,5 кілаграм, даўжыня — 750 міліметраў.

— Адной з найбольш важных асаблівасцяў комплексу з'яўляецца магчымасць злучэння некалькіх пускавых кантэйнераў і адначасовай стральбы з двух і больш вырабаў, злучаных паміж сабой, — адзначаюць распрацоўшчыкі гранатамётнага комплексу «Сапфір». — Гэта дазваляе трапляць у нашмат большую колькасць патэнцыяльных цэляў, якімі могуць быць танкі з актыўнай абаронай, шматлікія ўмацаванні, бункеры і іншае.

Гранатамёт здольны паражаць цэль на адлегласці да кіламетра. «Сапфірам», напрыклад, можна праламаць жалезабетонную сцяну таўшчынёй да 150 міліметраў, цагляную — да 250 міліметраў. Асколачнае дзеянне боепрыпаса дазваляе паражаць жывую сілу ў сродках індывідуальнай абароны ў радыусе да сямі метраў. Дзякуючы новаму высокаэнергетычнаму рухавіку, стральбу можна весці з закрытых памяшканняў.

Па словах спецыялістаў кампаніі, комплекс выкарыстоўваецца і ў якасці міні-РСЗА (рэактыўнай сістэмы залпавага агню) з розных платформ: трыногі, кіраванай перасоўнай платформы або дрона. «Кіраванне гранатамётам можа быць аддаленым: «начынка» комплексу поўнасцю лічбавая — пачынаючы ад пускавой прылады, заканчваючы ўзрывальнікам, — удакладняе галоўны канструктар распрацоўкі. — Што датычыцца гранатамётных сістэм, гэта першае такое рашэнне ў свеце. Камп'ютарызаваныя прыцэльныя прылады, распаўсюджаныя сёння на рынку, ужо зрабілі да нас. Такая ж лічбавая «начынка» комплексу з выбарам рэжымаў агню прадстаўлена ўпершыню».

Як паведамілі распрацоўшчыкі, гранатамёт знаходзіцца на этапе выпрабаванняў. Неўзабаве ён паступіць на ўзбраенне беларускай арміі.

### Беспілотнікі — пад кантролем

Абсалютна новая распрацоўка, прадэманстраваная на выстаўцы прадпрыемствам «Белспецзнештэхніка», — мабільная станцыя радыёэлектроннай барацьбы з беспілотнымі лятальнымі апаратамі, прызначаная для пошуку, разведкі і вызначэння месцазнаходжання БЛА.

Як расказаў **начальнік аддзела ДЗГУП «Белспецзнештэхніка» Сяргей АСВЯЦІМСКІ,** работу станцыі забяспечваюць дзве асноўныя сістэмы: разведкі і падаўлення. «Сістэма разведкі прадстаўлена трыма падсістэмамі і дазваляе вызначаць месцазнаходжанне беспілотных лятальных апаратаў пры дапамозе радыёразведкі, радыёлакацыйнай і аптычнай разведак, — удакладняе спецыяліст. — Радыёразведка ажыццяўляецца пры дапамозе ўбудаванай радыёлакацыйнай станцыі, аптычная разведка адбываецца з дапамогай оптыка-электроннага комплексу, размешчанага на пярэдняй мачце. На задняй мачце знаходзіцца сістэма падаўлення, якая ўздзейнічае на каналы кіравання і перадачы выяўленых даных БЛА, навігацыю асноўных навігацыйных сістэм, ажыццяўляецца пуфінг — стварэнне скажонага поля для беспілотных лятальных апаратаў».

Асноўныя тэхнічныя характарыстыкі станцыі: работа ў дыяпазоне — ад 200 да 6 тысяч Мгц, далёкасць радыёразведкі — да 50 кіламетраў, радыёлакацыйнай разведкі — да 22 кіламетраў, аптычнай разведкі — да 10 кіламетраў, далёкасць падаўлення каналаў кіравання і перадачы даных беспілотных лятальных апаратаў — да 30 кіламетраў, далёкасць падаўлення навігацыі — да 40 кіламетраў.

«У гэтай распрацоўцы мы ўпершыню прымянілі монастатычную радыёлакацыйную станцыю: восем радыёлакатараў ажыццяўляюць агляд па азімуце ў 360 градусаў, — заўважае Сяргей Асвяцімскі. — Другая навінка — пеленгатар-выявіцель малагабарытных дронаў. Апошні вопыт баявых дзеянняў паказвае, што цяпер любое сухапутнае падраздзяленне, нават самае дробнае, мае ў сваім штаце малагабарытныя дроны для вядзення разведкі, перамяшчэння боепрыпасаў і іншых мэт. Калі якінебудзь з дронаў пачынае працаваць у зоне вызначальных частот, аўтаматычна ўключаецца пеленгатар-выявіцель. Інфармацыю аб месцазнаходжанні беспілотнага лятальнага апарата дазваляе вызначаць спецыяльнае праграмнае забеспячэнне. Такім чынам, аператар засяроджваецца на найбольш важных аб'ектах, а сама станцыя ў аўтаматычным рэжыме абараняе аб'ект ад малагабарытных лятальных апаратаў».

### Адзін модуль замест дзесяці вогнетушыцеляў

Адна з вядучых айчынных кампаній, якая займаецца вытворчасцю электронных сродкаў барацьбы з агнём, — «Авангардспецмантажплюс» — на выстаўцы прадставіла сістэмы для выяўлення і тушэння магчымых пажараў на ваеннай тэхніцы. Такія сістэмы прымяняюцца і на буйных будаўнічых машынах, аўтобусах, іншых транспартных сродках. Напрыклад, сістэма «Багаж» дазваляе выявіць і запусціць працэс тушэння на ранняй стадыі ўзгарання. У прыватнасці, яна здольная абараніць ад пашкоджання кабіну, маторны адсек, хадавую частку.

Паклапаціліся спецыялісты прадпрыемства не толькі аб тым, як выявіць пажар, але і чым яго тушыць. Прэзентаваны падчас выстаўкі модуль парашковага пажаратушэння, які ўстанаўліваецца на тэхніку, аўтаматычна спраўляецца з узгараннем. Адна ўстаноўка можа патушыць пажар на плошчы 4 $м^2$. Прычым, за кошт камбінаванага тушэння, устаноўка здольная справіцца з агнём на паверхні. Як сцвярджаюць распрацоўшчыкі, нічога падобнага на постсавецкай прасторы няма. Аналагічныя модулі ствараюцца і ў іншых краінах, але патушыць адкрыты ачаг парашком пакуль могуць толькі сістэмы, створаныя беларускімі спецыялістамі.

— У модулі выкарыстоўваюцца два кампаненты, якія маюць вогнетушыльную здольнасць, — гэта аэразоль і парашок, — расказвае аб унікальнасці сістэмы **намеснік дырэктара ТАА «Авангардспецмантажплюс» Максім ПІНАЕЎ.** — Актуальнасць і неабходнасць гэтай распрацоўкі ўзнікла па той прычыне, што ні аэразоль, ні парашок паасобку не здольныя ў пэўных сітуацыях лакалізаваць ачаг узгарання. У нашым модулі выкарыстоўваюцца абодва кампаненты, якія дзейнічаюць па-рознаму, — назіраецца сінергетычны эфект. Парашок, які выкідваецца, збівае полымя з гаручай нагрузкі. Затым выходзіць аэразоль, якая выконвае некалькі функцый, у тым ліку тушыць пажар. Яшчэ адным немалаважным нюансам з'яўляецца шырокі тэмпературны дыяпазон (працоўная тэмпература ад -50 да +125), што дазваляе ўстанаўліваць модулі ва ўсе машыны ў любых кліматычных паясах.

Па словах **тэхнічнага кансультанта ТАА «Авангардспецмантажплюс» Дзмітрыя СЯНЬКО,** модуль парашковага пажаратушэння садзейнічае жыццеўстойлівасці тэхнікі. «Адзін модуль справіцца лепш, чым дзесяць вогнетушыцеляў, — падкрэслівае ён. — Асабліва гэта актуальна ва ўмовах баявога рэжыму: модуль абараняе тэхніку і асабовы склад, які ў ёй знаходзіцца. Ён гарантавана збівае полымя, тушыць агонь, што дае магчымасць працягваць баявую задачу. У выніку ні тэхніка, ні людзі не выходзяць са строю».

### Абарона ад куляў і асколкаў

Традыцыйна на MILEX свае навінкі прадстаўляе і флагман айчыннай навукі — Нацыянальная акадэмія навук. Адна з распрацовак, як запэўніваюць спецыялісты, створана літаральна некалькі дзён назад. Размова ідзе пра керамічны шчыт БР-5 класа, які вытрымлівае кулі снайперскай вінтоўкі Драгунова. Яго вага — 32 кілаграмы. Нялёгкі, вядома — затое ва



Распрацоўкі, створаныя на прадпрыемстве «ЛЭМТ», высокатэхналагічныя і запатрабаваныя сучаснай абстаноўкай.

ўмовах вядзення бавых дзеянняў ад яго залежыць многае. Для параўнання керамічны шчыт БР-4 класа важыць 25 кілаграмаў.

У экспазіцыі НАН — і новы штурмавы касцюм з плечавымі і пахавымі элементамі, якія дагэтуль не былі прадугледжаны ў падобным абмундзіраванні. Як звяртаюць увагу распрацоўшчыкі, падобныя ноу-хау дыктуе спецыяльная ваенная аперацыя ва Украіне.

**Намеснік загадчыка сектара арганізацыі і развіцця вытворчасці Фізіка-тэхналагічнага інстытута Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Мікіта КУКРЭШ** паказвае пліты, якімі камплектуюцца сучасныя бронекамізэлькі, а таксама падбой пад тэхніку. «Ён устанаўліваецца на любую тэхніку: гэта можа быць бронетэхніка, аўтамабілі, катары, верталёты — усё, што заўгодна, — прыводзіць прыклад распрацоўшчык. — Калі дзесьці адбываецца выбух і бронеэлементы самой тэхнікі пашкоджваюцца, гэты элемент здольны ўтрымліваць асколкі, якія звычайна трапляюць у тэхніку. Безумоўна, гэта ратуе жыццё экіпажу. Яму неабходна пакінуць недзеяздольную тэхніку і перасесці ў іншую, пасля чаго працягваць выкананне пастаўленых задач».

Адна з навінак, створаная супрацоўнікамі Фізіка-тэхналагічнага інстытута НАН, — супрацьасколачная коўдра. Ёй можна накрыць любое выбуховае рэчыва, напрыклад знойдзенае ў горадзе, і выклікаць групу разміміравання. Калі да прыбыцця сапёраў адбудзецца выбух, то ніякай пагрозы ён не нясе — асколкі застаюцца пад гэтай коўдрай.

### Высокаінтэлектуальныя напрацоўкі

Традыцыйна сваімі навінкамі ў галіне оптыка-электроннага высокадакладнага прыборабудавання здзіўляе Навукова-тэхнічны цэнтр «ЛЭМТ» Беларускага оптыка-механічнага аб'яднання. На выстаўцы — самыя перадавыя распрацоўкі. У прыватнасці, астуджальны цеплавізійны бінокль. Нягледзячы на тое, што гэты ручны камбінаваны прыбор аператыўнай разведкі невялікі па габарытах, ён выяўляе цэлі, якія знаходзяцца на адлегласці да 20 кіламетраў: можа выявіць як аўтамабіль, тэхніку, так і чалавека. Прыбор настолькі кампактны, што яго зручна насіць з сабой.

Вельмі важны кірунак, якім у цяперашні момант займаюцца спецыялісты прадпрыемства, — мадэрнізацыя супрацьтанкавых комплексаў тыпу «Конкурс», якія стаяць на ўзбраенні беларускай арміі. «Гэтая тэхніка вельмі надзейная, — звяртае ўвагу **намеснік дырэктара па оптыка-электронных прыборах Андрэй ВЯРШЫНІН.** — Пры гэтым яна патрабуе мадэрнізацыі. Мы распрацавалі і пастаўляем, у тым ліку ў Міністэрства абароны, цеплавізійны модуль для ўстаноўкі на штатнае месца прыцэльнага прыбора ТРК, які робіць яго ўсесутачным і ўсепагодным. Таксама мы перапрацавалі сам прыбор навядзення: можам яго ствараць, рамантаваць і мадэрнізаваць на сучаснай элементнай базе. Далейшае развіццё гэтага кірунку — мадэрнізацыя комплексу для магчымасці кіравання ракетамі па лазерным промні».

Распрацоўваюць на «ЛЭМТ» і трэнажоры для гранатамётаў, мінамётаў — для таго, каб спецыялісты атрымлівалі навыкі работы на гэтым узбраенні. Яшчэ адна новая распрацоўка — аўтаматызаваная сістэма кіравання агнём мінамётнай батарэі. «Гэта вельмі перспектыўная рэч, — акцэнтуе ўвагу Андрэй Вяршынін. — Аўтаматызацыя стральбы вельмі актуальная ў свеце падзей, якія адбываюцца ва Украіне. Яны паказалі, што трэба пераходзіць на камп'ютарную сістэму кіравання, паколькі гэта эфектыўна, сучасна і захоўвае многія жыцці».

Працуюць спецыялісты прадпрыемства і па такім актуальным кірунку, як выяўленне і барацьба з дронамі. Створаны комплексы для выяўлення, ідэнтыфікацыі і суправаджэння беспілотных лятальных апаратаў. Зусім новы кірунак распрацоўшчыкаў-інтэлектуалаў — барацьба з такімі аб'ектамі з дапамогай лазераў.

### І мішэнь, і сродак паражэння

Самых сучасных беспілотных лятальных апаратаў на выстаўцы было прадстаўлена ў вялікай колькасці. Цікавасць да беспілотнікаў з боку многіх аўтарытэтных прадпрыемстваў ваенна-прамысловага комплексу абумоўлена шырокім выкарыстаннем іх на сучасным полі бою. Любы канфлікт сучаснасці ўжо немагчыма ўявіць без гэтых жалезных «птушак», якія могуць выконваць шырокі спектр задач.

У прыватнасці, шматфункцыянальны беспілотны комплекс «Міратворац» прызначаны для вывядзення са строю лёгкабраніраванай і аўтамабільнай тэхнікі, падаўлення агнявых пунктаў праціўніка, размешчаных у цяжкадаступных месцах, паражэння наземных і марскіх цэляў. Беспілотнік здольны праводзіць разведку, наводзіць і карэкціраваць агонь у рэжыме рэальнага часу, знішчаць комплексы радыёэлектроннай барацьбы і супрацьпаветранай абароны праціўніка. Прызначаны для навучання разлікаў зенітна-ракетных комплексаў у выяўленні і знішчэнні паветраных цэляў. «З улікам сучаснай абстаноўкі гэта перспектыўная распрацоўка, якая неабходна нашай арміі для абароны тэрытарыяльнай цэласнасці дзяржавы, здароўя і жыцця нашых грамадзян», — рэзюмаваў **намеснік начальніка аддзела выпрабаванняў ТАА «КБ «Беспілотныя верталёты» Віталь ЯРАШЭВІЧ.**

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.**

### У тэму

**Намеснік міністра абароны па ўзбраенні — начальнік узбраення Узброеных Сіл Беларусі генерал-маёр Андрэй ФЕДЗІН:**

— Мы вельмі дэталёва і ўважліва вывучаем досвед спецыяльнай ваеннай аперацыі. Спецаперацыя пацвердзіла высокую важнасць сродкаў супрацьпаветранай абароны, авіяцыі. Нельга скідаць з рахункаў і ўзбраенне сухапутных войскаў. У першую чаргу артылерыі, бранятанкавага ўзбраення і тэхнікі, любыя браніраваныя машыны, якія могуць выкарыстоўвацца на полі бою. Абарона ад беспілотнікаў — адзін з прыярытэтаў дзейнасці ваеннага ведамства. Гэта праблема з'яўляецца актуальнай не толькі па досведзе сучасных узброеных канфліктаў. Яна стала актуальная некалькі гадоў таму, і мы ўдзяляем гэтаму вялікую ўвагу.




# ГРАДУС ЯКАСЦІ

## «Мінск Крышталь» адзначае 130-гадовы юбілей

## СПАЛУЧЭННЕ ТРАДЫЦЫЙ І НАЙНОЎШЫХ ТЭХНАЛОГІЙ

**Сёння ААТ «Мінск Крышталь» — кіруючая кампанія холдынга «Мінск Крышталь Груп» — найбуйнейшы ў Беларусі вытворца алкагольнай прадукцыі. Гутарым з генеральным дырэктарам прадпрыемства Ігарам ШУСТАВЫМ.**


Генеральны дырэктар Ігар ШУСТАЎ.

***— Ігар Паўлавіч, нядаўна ваша прадпрыемства занесена на Дошку гонару Ленінскага раёна сталіцы па выніках знешнеэканамічнай дзейнасці. Раскажыце пра іх.***

— Сапраўды, штогод мы прырастаем па экспарце. Мінулы год скончылі з дынамікай 125 % па экспарце ў грашовым выражэнні. Сёлета таксама рухаемся з добрым прыростам — 117 %. Удзельная вага экспарту па холдынгу «Мінск Крышталь Груп» — мінімум 25 % аб'ёмаў вытворчасці, па прадпрыемстве «Мінск Крышталь» — яшчэ больш.

Пастаўкі ажыццяўляюцца ў больш чым 20 краін свету. Да нядаўняга часу працавалі ў трох напрамках: Еўрапейскі саюз, Расія і краіны дальняй дугі — Кітай, В'етнам, Венесуэла, амерыканскі кантынент. Цяпер пачынаем асвойваць і Афрыканскі кантынент. Структура экспарту апошнім часам крыху змянілася, бо зменшыліся пастаўкі ў краіны Еўрасаюза. Калі раней туды адгружаліся пераважна сыравіна і паўфабрыкат, то цяпер — бутыляваная прадукцыя, і па ёй, дарэчы, дынаміка складае каля 130 %. Пастаўкі ажыццяўляюцца праз нашу таваправодную кампанію «Белхарчпрам» у Рызе, якая працуе больш за 15 гадоў. Наша прадукцыя добра вядома на рынках краін Балтыі, Польшчы і Германіі, цікавасць у спажыўцоў да яе захавалася, бо гэта найперш цана і якасць. Таму адгрузкі працягваюцца.

Удзельная вага паставак у Расію апошнім часам расце. Гэта краіна займае ў агульным аб'ёме экспарту каля 65 %. Пры гэтым памяняліся смакавыя перавагі расійскага спажыўца. Актыўна пастаўляецца каляровая лінейка нашай алкагольнай прадукцыі.

Нядаўна мы прыступілі да цікавага праекта — летась вывелі на рынак новы прадукт пад гандлёвай маркай «Бімбер». Мы вырабляем уласныя зерневыя дыстыляты на нашым спіртзаводзе і робім іх гадавую вытрымку па класічных правілах — у дубовых бочках. Атрымалі першую прадукцыю, цяпер яна знаходзіцца ў продажы ў нашых фірмовых крамах і гандлёвых сетках. І маем нядрэнныя водгукі.

Гэту лінейку мы развіваем і далей. Напой гандлёвай маркі «Ведрыч» — наша класіка, рэцэптуры больш за 20 гадоў. Мы пашырылі асартымент: дадалі такія смакі, як апельсін, дурніцы, клубніцы. Сёння гэта папулярны напой.

***— А якая гандлёвая марка самая папулярная?***

— Асноўны лідар на сёння — прадукцыя нашай знакамітай гандлёвай маркі «Канаплянка». Яна мае выдатныя водгукі і ў Беларусі, і ў Расіі.

Асаблівы гонар — першы ў Беларусі арганічны напой «Белая Русь». Яшчэ працуючы першым намеснікам кіраўніка канцэрна «Белдзяржхарчпрам», я паставіў сабе задачу аднавіць гэты крысталаўскі брэнд. Гэта гонар прадпрыемства і без перабольшвання нацыянальны гонар. Раней гэта была вельмі папулярная прадукцыя, але незаслужана забытая.

Летась выпусцілі арганічны прадукт «Белая Русь». У ім ніякіх штучных дабавак і араматызатараў, пестыцыдаў, ГМА і іншай хіміі, толькі натуральныя прыродныя кампаненты. Прадукцыя створана па ўсіх правілах арганічнага земляробства і сертыфікавана як арганічная прадукцыя. Экалагічна чыстае зерне вырошчваюць у гаспадарцы Гродзенскай вобласці, дзе на палях не прымяняюць пестыцыдаў. Прадукт без штучных інгрэдыентаў цяпер — трэнд, не толькі ў нас, але і ў многіх замежных спажыўцоў. Адразу як толькі яго вывелі на рынак, на выстаўцы «Прадэкспа» ён узяў залатыя медалі. На сёння гэта першы і сапраўдны арганічны моцны напой у Беларусі. У планах — пашырэнне лінейкі, але гэта прэміяльны і святочны прадукт.

І, натуральна, засталася наша класіка — знакамітыя нашы брэнды «Усяслаў Чарадзей», «Радзівіл».



***— Здаецца, што выраб алкагольнай прадукцыі — працэс кансерватыўны, дзе складана штосьці мяняць. Што робіцца, каб завод заставаўся гістарычнай каштоўнасцю толькі звонку?***

— Мадэрнізацыя — працэс, які не спыняецца. І тут некалькі складнікаў. Першы — якасць, наша аснова, мэта і самы галоўны інструмент. «Мінск Крышталь» заўсёды славіўся гэтым кампанентам, і мы абавязаны яго падтрымліваць на самым высокім узроўні. У нас ажыццяўляецца пільны кантроль якасці, пачынаючы ад зерня, заканчваючы выхадам гатовай прадукцыі. Плюс на ўсіх этапах ажыццяўляецца кантроль якасці самой вытворчасці — пры закладцы зерня, пры купажы, разліве, упакоўцы — усе стадыі кантралююцца. Няякаснага прадукту апрыёры быць не можа, не кажучы пра небяспечны.

Другі момант — мы пастаянна вывучаем смакавыя перавагі нашых спажыўцоў. Гэта не канстанта, яны мяняюцца. Вядома, класіка застаецца запатрабаванай, і наш спажывец — той, хто аддае перавагу традыцыйным для нашай краіны моцным напоям. Таму, натуральна, захоўваюцца класічныя прыёмы і тэхналогіі вытворчасці. Аднак рынак не стаіць на месцы — укараняюцца новыя тэхналагічныя прыёмы, ствараюцца іншыя прадукты.


У цэху № 3.

Распрацоўка новых відаў прадукцыі, брэндаў, прымяненне розных купажоў, дабавак, рознай фільтрацыі — працэс на прадпрыемстве няспынны. Напрыклад, кожны напой праходзіць некалькі ступеняў фільтрацыі, пачынаючы ад звычайнай вугальнай, заканчваючы залатой, плацінавай, жамчужнай, сярэбранай, ільняной, брыльянтавай.

